УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт эстэтычнай адукацыі
Кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ РЭГІЯНАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ПАЗАШКОЛЬНАЙ РАБОЦЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыпломная работа
студэнткі 508 групы
5 курса спецыяльнасці
«Сусветная і айчынная культура. Фальклор»
завочнай формы
атрымання адукацыі
__________ Бабчанок
Ганны Мікалаеўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ________ Бычкова Н.В.
Пратакол №12 ад 21.04. 2016 г.

Навуковы кіраўнік:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
__________ Н.Г.Мазурына

Абаронена 04.06. 2016 г.
з адзнакай «дзесяць»

Мінск, 2016

# РЭФЕРАТ

**Тэма дыпломнай работы:** “Патрыятычнае выхаванне школьнікаў сродкамі рэгіянальнага фальклору ў пазашкольнай рабоце”.

**Аб’ект даследавання:** патрыятычнае выхаванне школьнікаў.

**Прадмет даследавання:** формы і метады патрыятычнага выхавання сродкамі рэгіянальнага фальклору ў пазашкольнай дзейнасці з дзецьмі школьнага ўзросту.

**Мэта работы:** выявіць патрыятычна-выхаваўчыя магчымасці вывучэння рэгіянальнага фальклору (на прыкладзе Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці) у пазакласнай рабоце са школьнікамі.

**Метады даследавання:** параўнанне, назіранне, аналітычны, эмпірычны, метад тэарэтычных даследаванняў.

**Даследаванне і распрацоўкі:** прааналізаваны тэарэтычныя асновы вывучэння рэгіянальнага фальклору, разгледжаны сутнасць і напрамкі патрыятычнага выхавання, даследаваны формы і метады выкарыстання рэгіянальнага фальклору ў пазашкольнай рабоце, сістэматызаваны вопыт выкарыстання фальклору ў пазашкольнай рабоце ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці і распрацаваны адпаведныя метадычныя рэкамендацыі.

**Элементы навуковай навізны:** сёння з’явіліся пазітыўныя тэндэнцыі адраджэння і захавання народных традыцый, ствараюцца і ўкараняюцца ў жыццё мастацка-вучэбныя праграмы, заснаваныя на нацыянальных традыцыях, распрацоўваюцца планы адраджэння народнай культуры ў розных абласцях Рэспублікі Беларусь, рэфармуецца сістэма адукацыі і выхавання. Праблема дынамічнага развіцця сістэмы патрыятычнага выхавання і развіцця падрастаючага пакалення стаіць сёння перад грамадствам асабліва востра. Адной з важнейшай праблем, вырашэнне якой патрабуе выпрацоўкі навуковай канцэпцыі, распрацоўкі дэтальнай праграмы, з’яўляецца праблема ўзаемадзеяння сацыяльных інстытутаў у вобласці выхавання і адукацыі. Як паказваюць назіранні, адукацыйна-выхаваўчы працэс патрабуе комплекснасці і сістэмнасці.

**Апрабацыя (укараненне):** асноўныя палажэнні навуковага даследавання апрабіраваны на IV Міжфакультэцкай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі “Эстэтычная адукацыя: традыцыі і сучаснасць” (15 снежня 2015 г.), Рэспубліканскай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі “Студэнцкая навука – інавацыйны патэнцыял будучыні” (26-28 красавіка 2016 г.), на якой атрыманы дыплом II ступені (гл. Дадатак В), на X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі)”(29 красавіка – 1 мая 2016г.).

**Апублікаванне вынікаў:** па тэме даследавання надрукавана шэсць публікацый (гл. Спіс выкарыстанай літаратуры: публікацыі аўтара).

Дыпломная работа складаецца з уводзінаў, чатырох глаў, заключэння, спіса літаратуры, трох дадаткаў. Агульная колькасць старонак – 55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ